# *А.М. ЛЯЎДАНСКІ – ПАЧЫНАЛЬНІК ПОЛАЦКАЙ АРХЕАЛОГІІ*

***У 2008 годзе споўнілася 80 гадоў з таго моманту, калі ў Полацку пачала працаваць археалагічная экспедыцыя пад кіраўніцтвам вядомага беларускага археолага Аляксандра Мікалаевіча Ляўданскага. І хаця археалагічныя даследаванні праводзіліся ў Полацку і раней гэтага часу, базавыя пытанні развіцця тапаграфіі горада, яго планіровачнай структуры былі ўпершыню сістэмна разгледжаны экспедыцыяй Інбелкульта.***



***А.М. Ляўданскі – пачынальнік полацкай археалогіі, ён упершыню вызначыў, што старажытнае полацкае гарадзішча, пачатковы дзяцінец горада, знаходзілася на пагорку мысавага тыпу ў рэчышчы Палаты.***

***А.М. Ляўданскі таксама вызначыў, што функцыі дзяцінца Полацка гарадзішча мела да канца XII стагоддзя, калі ў вусці Палаты паўстае новы дзяцінец – Верхні замак. Гэтая думка блізкая да вынікаў сучасных даследаванняў з тым удакладненнем, што пачатковы дзяцінец існаваў на гарадзішчы да пачатку XIV стагоддзя.***

***А.М. Ляўданскі ўпершыню пазначыў магчымасць перапланіроўкі Полацка падчас Лівонскай вайны, у прыватнасці змену русла Палаты. Пошук старажытнага паселішча каля падножжа гарадзішча даследчык не паспеў правесці, але вызначыў магчымасць яго размяшчэння па накірунку ад гарадзішча ўздоўж Палаты да Дзвіны. Сёння наяўнасць старажытнага паселішча каля падножжа гарадзішча з'яўляецца навуковым фактам.***

***А.М. Ляўданскі даследаваў на Верхнім замку сляды старажытнай пабудовы з плінфы, якая, магчыма, з'яўляецца яшчэ адным помнікам полацкага манументальнага дойлідства XII стагоддзя. Ён выказаў трапнае меркаванне, што Верхні замак быў заселены не раней за XI стагоддзе, што пацверджана сучаснымі археалагічнымі даследаваннямі.***

***На тэрыторыі «Старога горада» (Запалоцце) А.М. Ляўданскі адкрыў сляды старажытнага пасада. Праведзеныя раскопкі на тэрыторыі Бельчыцкага Барысаглебскага і Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыроў прывялі даследчыка да высновы аб адсутнасці на іх тэрыторыях слядоў пасялення раней за XII стагоддзе, што сведчыць аб асаблівай ролі манастыроў у горадабудаўнічай структуры тагачаснага Полацка.***

***Такім чынам, усе даследаванні А.М. Ляўданскага ў г. Полацку пачынаюцца са слова «Упершыню...». Геніяльны даследчык беларускай даўніны заклаў краевугольныя камяні сучаснаму ўяўленню пра сацыятапаграфічную структуру найстаражытнейшага горада Беларусі.***

***У методыцы даследаванняў А.М. Ляўданскі абапіраўся на даныя этнаграфічных крыніц, што дазволіла верыфікаваць звесткі пра змены ў 1563 годзе рэчышча Палаты, наяўнасці старажытнейшага пасада ў Запалоцці.***

***Такім чынам, А.М. Ляўданскаму належыць гонар узвядзення на старажытным падмурку гістарычнага вывучэння Полацка асновы сапраўднага дома археалагічнай навукі, аздобу якога працягваюць ствараць сучасныя навукоўцы.***

***Сёння археолага-этнаграфічны накірунак даследавання Полацка і Беларускага Падзвіння з'яўляецца адным з прыярытэтнейшых у дзейнасці Полацкага дзяржаўнага універсітэта – вышэйшай навучальнай установы на старажытнай Полацкай зямлі, якая пачала дзей-***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

***насць у 1968 годзе ў г. Наваполацку. Этнаграфічныя экспедыцыі праводзяцца штогадова з 1994 года, іх вынікам сталі шматлікія навуковыя адкрыцці ў справе вывучэння традыцыйнай народнай культуры беларусаў Падзвіння.***

***Археалагічныя раскопкі супрацоўнікаў ПДУ працягваюць традыцыі археалагічнага даследавання Полацка і Полацкай зямлі, закладзеныя славутымі папярэднікамі.***



***Г.В. Штыхаў і маладыя археолагі***
***на старажытным полацкім гарадзішчы (2007 г.)***

***Прымеркаваная да юбілею археалагічнага вывучэння Полацка рэспубліканскі навукова-практычны семінар ставіць мэту аб'яднання намаганняў археолагаў, этнолагаў, антрапологаў, лінгвістаў і краязнаўцаў у спасціжэнні гістарычнага мінулага Падзвінскага краю і сумежных тэрыторый. Адна з яго задач – пашырэнне вопыту арганізацыі міждысцыплінарных краязнаўчых даследаванняў у розных рэгіёнах свету.***

***Д.У. Дук, кандыдат гістарычных навук, дацэнт,***
***загадчык кафедры айчыннай і ўсеагульнай гісторыі***
***Полацкага дзяржаўнага універсітэта***

Электронный архив библиотеки ... ова